Радыё “Свабода”
16.10.2018

# «Хачу шоў каля Нацыянальнай біблітэкі». 22 гады таму беларус зьехаў у ЗША і стаў там вядомым мастаком

Аляксандра Дынько

**Беларуса Пятра Бярдоўскага з-пад Горадні сьвет ведае як візуальнага мастака Zebbler. Цяпер ён жыве ў Бостане, займаецца мультымэдыйным мастацтвам, робіць сьветлавыя шоў, музыку, езьдзіць на гастролі і выступае на крутых фэстывальных пляцоўках. А ў 2007-м стаў сусьветна вядомым, справакаваўшы падзею, якую назвалі Boston Mooninite panic. Тады шматлікія рэклямныя плякаты, якія мастак зрабіў разам са сваім калегам, прынялі за бомбы.**

**Беларусь Пётра пакінуў 22 гады таму і ніколі дагэтуль не вяртаўся. Яго ўражвае будынак Нацыянальнай бібліятэкі, чысьціня і тое, што людзі тут выглядаюць шчасьлівымі. Але ён упэўнены, што ў свае 16 зрабіў правільны выбар, зьехаўшы ў ЗША.**




Журналістка Радыё Свабода сустрэлася з мастаком каля Нацыянальнай бібліятэкі, каб паслухаць пра ягоныя ўражаньні ад падарожжа ў часе.

— Я прыехаў па «бязьвізу». Было лягчэй, чым я думаў. Хоць трошкі дзіўна на мяне глядзелі, калі правяралі пашпарт.

**— Можа, вінаватая фрызура?**

— Хто яго ведае. На мяне зьвяртаюць увагу, вядома. Першае пытаньне — колькі гадоў гэтым валасам.

**— І колькі?**

— Васямнаццаць.

**— Амаль столькі ж, колькі вы жывяце ў Амэрыцы?**

— Так. Як толькі я разабраўся з эміграцыйнымі пытаньнямі, стаў адгадоўваць валасы. Мне падабаецца такая прычоска. Гэта для мяне такі павольны гадзіньнік. Цяпер ён паказвае 18 гадоў.




**— Вярнуцца ў Беларусь праз 22 гады — гэта як зрабіць падарожжа ў часе...**

— Падобна. Тут шмат чаго зьмянілася. Вось такога я дакладна ніколі ня бачыў (паказвае на будынак Нацыянальнай бібліятэкі). Гэта прыгожа. Усё ў Менску вельмі чыста і прыемна. Але адчуваю мінулую эпоху. Наведалі помнік Леніну. Ён усё яшчэ стаіць.

**— Як вам здаецца, ці камфортна людзям жыць у Менску?**

— Мне ўсё падабаецца, але я турыст. Пытацца трэба ў тых, хто тут жыве. Усё гэта каштуе грошай, і ў людзей трэба запытацца, на што гэтыя грошы патрацiць найперш.

У Бостане таксама ідуць такія дыскусіі. Мы ўважлівыя да гентрыфікацыі: калі новыя людзі з большымі грашыма перасяляюцца ў старыя раёны, але бяднейшыя людзі зь іх пераязджаюць, бо ня могуць сабе дазволіць там жыць. Зьяўляецца шмат прывабных рэчаў, але гэта стварае ўнутранае напружаньне.

Мая сям'я ў Беларусі выглядае шчасьлівай. Яны прагматычныя: кажуць, што ня маюць вялікіх грошай, але задаволеныя стабільнасьцю.



Журналістка Радыё Свабода Аляксандра Дынько і Пятро Бярдоўскі

**— Вы адчулі гэтую стабільнасьць? Што засталося такім жа, апроч помніка Леніну?**

— Улада. Кепска гэта ці добра, але стабільна. Тое, што адбываецца цяпер у Штатах, абсалютнае вар'яцтва. У нас дэмакратыя, і мы можам усё зьмяніць, і спрабуем зьмяніць, галасуючы супраць пэўнай партыі і пэўнай асобы. Гэта хаос, і мне гэта падабаецца, бо я магу выявіць сябе. Менавіта таму я і люблю гэтую краіну і выбраў яе шмат гадоў таму. Там яму магу выявіць сябе свабодна, без усялякіх абмежаваньняў. Гэта важна і каштоўна для мяне.

Але гэта, можа, ня так важна для іншых людзей, і я не магу асуджаць іхнае разуменьне. Яны выглядаюць шчасьлівымі, і я падтрымліваю іх у гэтым. Я таксама шчасьлівы ў ЗША, нягледзячы на ўсё вар'яцтва, якое там адбываецца.




**— Вы зьехалі ў 16 гадоў, можна сказаць малым, і сьвядома вырашылі застацца. Чаму?**

У мяне зьявіўся шанец стаць студэнтам па абмене, і я проста паехаў на год вучыцца і жыць у гасьцявой сям'і. Але галоўная прычына была ў тым, што я мастак. Я пісаў вершы, гісторыі, маляваў, але мне хацелася свабоды. Я быў трохі складаным дзіцём. Добра вучыўся. Але быў вельмі ўпартым, найперш мне была патрэбна мая асабістая свабода. Тут я разумеў, што тое, што я раблю, не вітаецца і нават у пэўным сэнсе не дазваляецца.

У мяне цудоўная гасьцявая сям'я. Яны старыя хіпі і прымалі мяне як асобу, далі мне магчымасьць цалкам раскрыць, хто я такі, праз усе памылкі і хваляваньні, якія праходзіць падлетак. Яны сталі маёй амэрыканскай сям'ёй.

Я разумеў, што ў Беларусі ў мяне ня будзе такіх магчымасьцяў для свабоды самавыяўленьня, як у Штатах. Там людзі сапраўды звар'яцелыя на свабодзе. Я дагэтуль перакананы, што зрабіў правільны выбар.



ПХ (RFE/RL)

**— І як вы скарысталі гэтыя магчымасьці?**

— Мне здаецца, што я пражыў чатыры жыцьці, вось цяпер пачынаю чацьвёртае. Я атрымаў у ЗША палітычнае прыстанішча, праз некалькі гадоў стаў грамадзянінам. Пайшоў у Масачусэцкі каледж мастацтваў. Маім галоўным напрамкам было відэа і шоў-прадакшн. У Бостане ў нас клясная супольнасьць зь людзей, якія займаюцца ў тым ліку мастацтвам відэапраекцыі.

Аднойчы я зразумеў, што аб’екты могуць быць паверхняй для відэапраекцый іншых аб’ектаў. Мы сталі ў пэўным сэнсе піянэрамі мастацтва відэамапінгу. Пасьля заканчэньня каледжу я далучыўся да гурту і раблю для іх праекцыі. Гэта сапраўды цяжка, вельмі шмат перашкод. Але я ўпарты, я ня здамся.




**— Быў момант, калі вы сталі сусьветна вядомым і [справакавалі паніку на ўвесь Бостан.](#) Тады вашыя сьветлавыя рэклямы для анімацыі прынялі за бомбы. Цяпер вы думаеце, што ўсё было зроблена правільна?**

— Я нікога не асуджаю. У мяне ёсьць адчуваньне, што мяне пакаралі за самавыяўленьне. Мы прымацавалі плякаты з выявамі герояў мультфільмаў, зробленых са сьвятлодыёдных лямпачак. Яны мусілі сьвяціцца ўначы і весяліць людзей. Але нехта пабачыў батарэйку, правады і падумаў, што гэта можа быць бомба. Ён зьвярнуўся ў паліцыю, а ў паліцэйскага ёсьць пратакол, паводле якога ён мусіць дзейнічаць. Нават калі ён паглядзеў і сказаў, што «гэта ня бомба», ён мусіць гэты пратакол выканаць. Яны мусілі пазваніць сваім начальнікам, а ў тых свае пратаколы.

Усё гэта раскрыла мне вочы на тое, як маленькі чалавек можа трапіць у вялікую палітыку. У выніку прэзыдэнт анімацыйнай кампаніі пайшоў у адстаўку. Сама кампанія заплаціла 2 мільёны даляраў. У пэўным сэнсе гэта быў законны хабар, бо гэта было зроблена, каб абвінавачаньне ня выставілі ў бок самой кампаніі. Хтосьці мусіў быць пакараны, і замест таго, каб адпусьціць нас, мы прайшлі праз суд.

Я разумею, як гэта пабудавана. Але гэта быў абсурд. Вось чаму тым ранкам, калі нас вызвалілі з турмы, мы таксама вырашылі быць абсурднымі. Нас акружылі дзясяткі камэр, журналістаў; усе крычалі, задавалі нам пытаньні, быў жывы эфір на нацыянальным ТВ, але мы гаварылі толькі пра фрызуры 70-х. Проста каб паказаць абсурднасьць усяго гэтага, каб раззброіць іх сваім гумарам. Гэта ня бомба, у мяне няма патрэбы гаварыць пра бомбы, пра палітыку, давайце пагаворым пра фрызуры 70-х. Ведаеце што-небудзь пра гэта? Як гэта было ў Беларусі? Вось гэта пытаньне!




**— Чаму відэамастацтва, сьветлавыя шоў прыцягваюць увагу людзей?**

— Думаю, што гэта адчуваньне магіі. Кожны ж шукае трошкі чараўніцтва ў жыцьці. Не абавязкова таму, што мы нудзімся штодзённасьцю. Проста таму, што гэта клясна. Вас прываблівае сьвятло, як яно рухаецца, як яно арганізаванае. Калі я здольны ўзяць яго пад кантроль, то я сапраўды магу пранікнуць у чалавечую сьвядомасьць і маніпуляваць чалавекам так, каб у пэўным сэнсе ўводзіць яго ў транс. І гэта сапраўды прыносіць мне задавальненьне. Напрыклад, калі сапраўды хтосьці добра сьпявае, ён пранікае вам у душу і захоплівае вас цалкам. Часам я адчуваю, што раблю тое самае са сваімі сьветлавымі шоў. Гэта фантастычна.

Я цяпер выступаю ў музычным гурце. Мы спалучаем музыку і візуальнае ў пэўную ілюзію. Наша асабістая філязофія — няма нічога забароненага. Гэта частка маёй бунтарскай натуры. Я бачыў на фэстывалях шмат прыкладаў мастацтва, якое занадта бяззубае. Людзі ідуць на фэстывалі, каб адпачыць, павесяліцца. Але весялосьць — гэта толькі частка чалавечых эмоцый. Чалавек можа адчуваць так шмат: страх, цікавасьць, трывогу, разгубленасьць... Усё гэта мае для нас значэньне. Калі я рыхтую візуал для нашых выступаў, стараюся ўсе гэтыя эмоцыі ўключыць. Часам мы робім нешта гратэскнае, дзіўнае, але і сэксуальнае. Спалучэньне дзіўнага і сэксуальнага бянтэжыць людзей, і нам падабаецца гэтае пачуцьцё, гэтае адчуваньне нерэальнага, псыхадэлічнага.




**— Вас уразіла наша бібліятэка. Як вам здаецца, ці правільна выкарыстоўваюць гэты будынак?**

— Я стараюся быць пазытыўным. Калі чалавек стараецца зрабіць нешта добрае, нават калі гэта трохі дзіўна, я думаю, што добра гэта падтрымаць і падзякаваць. Таму я ўдзячны, што такі будынак існуе, удзячны, што архітэктары былі дастатковымі вар’ятамі, каб яго пабудаваць. Як візуальны дызайнэр я, безумоўна, хачу «захапіць» гэты будынак і зладзіць тут канцэрт са сьветлавым шоў.

Мне таксама падабаецца, што гэта бібліятэка. Сюды людзі прыходзяць па веды і натхненьне. Цяпер усе кнігі, якія тут ёсьць, можна скласьці ў адзін вялікі кампутар. Кнігі вельмі прыемна чытаць, яны фізычна адчувальныя, але ў маім тэлефоне цяпер каля 50 кніг. Мяркую, трэба думаць пра тое, як бясьпечна перайсьці ў лічбавую эпоху. У ЗША і па ўсім сьвеце моладзь ужо пераходзіць у лічбу. Вялікая колькасьць маладых людзей расьце онлайн, а не на вуліцах. Яны камунікуюць са сваімі аднагодкамі ў інтэрнэце. Зьяўляюцца асаблівыя віды культур, якія існуюць толькі ў інтэрнэце, як seapunk ці vaporwave. Мяне захапляе, што гэта магчыма.

Думаю, што нас чакае абсалютна шалёная будучыня — культуры не спатрэбяцца фізычныя аб’екты. Я сам таксама постгуманіст, трансгуманіст. Я ўпэўнены, што мы мусім разьвіваць і выкарыстоўваць тэхналёгіі, якія дазваляюць нам мяняць нашую генэтыку і інкарпараваць кампутары ў нашыя целы. Але я пакуль стрымліваюся, каб з сабой такое зрабіць, бо прагматычны. Думаю, што яшчэ мы не да канца да гэтага гатовыя.




**— Лічбавае мастацтва, якім вы цяпер займаецеся, наколькі яно даступнае? Вось хлопчык з горадзенскай вёскі можа навучыцца маляваць алеем, але ці можа ён навучыцца таму, што ўмееце вы, ня зьехаўшы ў Амэрыку?**

— Калі я вучыўся ў каледжы ў Бостане, мае прафэсары казалі, што тое, што я зьбіраюся рабіць, немагчыма, бо ў мяне няма грошай. Яны прывыклі, што дзеля відэаінсталяцыі трэба зьвярнуцца да вялікай кампаніі і заплаціць сотні тысяч даляраў. І гэта немагчыма ані для мяне, ані для большасьці людзей у сьвеце. І на працягу ўсяго навучаньня я даводзіў, што гэта ня так, мне ня трэба так шмат грошай, каб рабіць лічбавае мастацтва. Усё, што мне трэба, гэта танны лэптоп, праектар і куча клясных ідэяў.

Я разумею, што для кагосьці нават гэта можа быць задорага. Але тэхналёгіі робяцца такімі таннымі! Інтэрнэт — гэта нашая вялізная бібліятэка. Там вельмі шмат чаму можна навучыцца. Моладзі гэта падабаецца. Некаторыя нават не ідуць у каледжы, а вучацца праз інтэрнэт. Я думаю, што шмат хто з моладзі пераўзыдзе тое, што я раблю цяпер. Усё, што ўмею, 16-гадовыя хутка змогуць рэалізаваць за 20 даляраў.




**— Ці вернецеся яшчэ ў Беларусь?**

— Адна з маіх мараў — выступіць тут. Магчыма, яна ажыцьцявіцца. Мой партнэр у гурце з Аляскі. Мы шмат у чым падобныя, і ягоная культура нагадвае мне беларускую. Я вырас у вёсцы, у доме без выгод. І ён таксама. Мне было гэта дзіўна, бо я думаў, што ЗША — гэта адукаваная заможная краіна, але аказалася, не паўсюль. І ў нас аднолькавае стаўленьне да жыцьця ў нечым, мы з малых гадоў разумеем, што яно можа быць суровым. Таму нам было б цікава прыехаць сюды і выступіць.